SEX=БАЛЯСЫ

# УЛОВУ ВАШЫМ СЕТКАМ!

**Адна маладая каляжанка прапанавала напісаць пра знаёмствы праз сацыяльныя сеткі. Падставай для гэтага стала пэўнае асабістае расчараванне дзяўчыны ў такім спосабе знайсці блізкую душу. Раз паспрабавала, другі, трэці — вынік атрымліваўся практычна нулявым. Прыкладна як у тым анекдоце. «Гэта ў інтэрнэце вы такія смелыя, а як гаварыць тосты на святах, дык сядзіце моўчкі ў спадзяванні, што да вас чарга не дойдзе». Красамоўствам і гумарам патэнцыяльныя кавалеры, як высветлілася, вызначаліся толькі ў сеціве, а ў рэальным жыцці іх запалу хапала на сустрэчу-другую, не больш. («Па суботах і нядзелях мала хто піша ў сацыяльных сетках. Адразу відаць — справай людзі заняты, а не на працы сядзяць».)**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Яшчэ адзін бок медаля — знешнасць. У інтэрнэце можна выставіць якую заўгодна фатаграфію, нават не сваю. Але гэта дзейнічае, пакуль справа не дойдзе да вочнага знаёмства. «Як я цябе пазнаю?» — «На мне будзе цяжар пражытых гадоў і сандалікі...» Прыкладна так адбылося ў іншай каляжанкі, калі пасля перапіскі ў сацыяльных сетках на сустрэчу з ёй прыйшоў... сябар віртуальнага кавалера. Яна і зараз не можа зразумець, чаму так здарылася і ў чым прычына. («Мужчына з вытанчаным густам шукае дзяўчыну з параметрамі 92,34х61,71х93,45. Пра сябе — не зануда».) Ці вось яшчэ бываюць персанажы, пра якіх зноў жа жартам сказалі б наступнае: «Калі раней можна было цішком зняць заручальны пярсцёнак, дык цяпер статус «жанаты» незаўважна ад жонкі не выдаліш». Выдаляюць, яшчэ як...

Не, вядома, ніхто не ставіць пад сумненне такі спосаб знаёмства, як сацыяльныя сеткі. Мабыць, кожны можа прывесці не адзін прыклад таго, як дзякуючы ім знаёміліся, сябры, сваякі знаходзілі аднаго адного такім чынам і справа заканчвалася вяселлем. Ды і знаёмствы па перапісцы ўвогуле не вынаходніцтва нашых дзён. Толькі некалі пісалі лісты на паперы і адказаў чакалі значна даўжэй, чым цяпер. Дык тэхналогіі! («Не разумею, як раней людзі жылі без «лайкаў»? Як да дзяўчат заляцаліся? На вуліцы знаёміліся, ці што? Недарэчнасць нейкая...») Ці вось яшчэ да тэмы. «Сацыяльныя сеткі заблакіраваны. Людзі хаатычна ходзяць па вуліцах са сваімі фоткамі і пытаюцца адно ў аднаго: «Табе падабаецца?») Цяпер зусім іншая справа, заляцацца на адлегласці можна анлайн. («Дзяўчына, мы з вамі сучасныя людзі, таму давайце праматаем хуценька, як кінастужку, знаёмства, кветкі, спатканні, рэстаран і — адразу да вас!» — «Няма праблем! Толькі давайце праматаем яшчэ далей: ты мне надакучыў, забірай рэчы і сыходзь!») У астатнім са знаёмствамі праз сеціва ўсё застаецца такім жа, як і ў рэальным жыцці: хтосьці расчаруецца («Не клеіцца асабістае жыццё? Замяніце клей!» Чым, дарэчы, многія і карыстаюцца. «Як асабістае жыццё?» — «У кожнай сацсетцы — па кавалеру!»), а некаму пашанцуе, не спяшаючыся, раскрыцца перад партнёрам, што пры асабістых стасунках не кожнаму пад сілу з прычыны характару.

**Вы б бачылі, колькі абурэння было ў вачах дзяўчыны! «Што вы там сабе думаеце?! Я не для Рыбака народжана!»**

Тая ж каляжанка, якой не пашчасціла перавесці віртуальныя стасункі ў рэальныя («Дзяўчаты, не трэба крыўдаваць на казлоў! Крыўдуйце на сябе: своечасова брамку ў агарод зачыняць трэба»), задуміва сказала, маўляў, вось некалі знаёміліся на танцах, у транспарце — рамантыка! (Адразу прыгадваецца Людміла з культавага савецкага фільма «Масква слязам не верыць»: «А я вось у навуковы зал Ленінскай бібліятэкі пропуск дастала». — «Навошта?» — «Уяўляеш, які там кантынгент? Акадэмікі, дактары, філосафы». — «Ну і што, будзеш глядзець, як яны чытаюць?» — «Многа ты разумееш! Там яшчэ курылка ёсць...») З чым пагаджуся, дык з тым, што раней сапраўды, каб пазнаёміцца з дзяўчынай, трэба было выклікаць у яе сімпатыю не ў віртуальным свеце, а гледзячы ў вочы. І ніякі Facebook у гэтым дапамагчы не мог, разлічваць можна было толькі на ўласнае пачуццё гумару, рашучасць і «падвешаны» язык. Але і яны не ратавалі, калі не было, як той казаў, іскры. («Ты свабодная ў панядзелак у пяць?» — «Так!» — «Шкада, я буду заняты».)

Неяк яшчэ адна каляжанка збіралася па справах працы на сустрэчу з Аляксандрам Рыбаком, нашым самым вядомым нарвежскім беларусам. Вось я і сказаў ёй жартам, маўляў, пазнаёмся бліжэй, такі хлопец, а ты не замужам... Вы б бачылі, колькі абурэння было ў вачах дзяўчыны! «Што вы там сабе думаеце?! Я не для Рыбака народжана!» Ні больш, ні менш. («Я вам не падабаюся?» — «Ды вы што? Вы моцны прафесіянал, добры і спагадлівы таварыш, цікавая суразмоўца...» — «Значыць, не падабаюся...») Рыбак, вядома, тут ні пры чым, ён нават не ведае, што мы пра яго размаўлялі. Проста гэта быў не яго «ўлоў». («Выходзь за мяне!» — «А што там... за табой?»)

Падагульняючы, магу сказаць толькі адно, у чым абсалютна ўпэўнены. Расстаўляйце свае «сеткі»! Хоць у інтэрнэце, хоць у рэальным жыцці. Галоўнае, каб быў «улоў», а таму трэба дзейнічаць, а не сядзець склаўшы рукі. Нават калі нешта не атрымалася з першага разу, гэта трэба пераждаць і ісці далей наперад. Наша шчасце — у нашых руках. Напрыканцы — анекдот да тэмы. «Назавіце вашы моцныя бакі». — «Ініцыятыўнасць!» — «Дзякуй, мы звяжамся з вамі». — «Я сам з вамі звяжуся!»

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Бярыце ініцыятыву ў свае рукі»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

Мы цяпер рыхтуемся да «Новай хвалі» і на ўласныя вочы пераконваемся, што ў гэты конкурс арганізатары ўкладваюць не толькі грошы, але і душу. З намі працуе цэлая каманда прафесіяналаў. Яны тэлефануюць, пішуць, мы абмяркоўваем дэталі. І нас як артыстаў такое стаўленне падкупляе.

***— Зараз вы працуеце самастойна, але пачыналі выступаць пад патранатам прадзюсараў. Калі зразумелі, што лепш рабіць усё самім?***

**Марыя Яковіч:** «Мы нядаўна ўзгадвалі той перыяд. Тыя людзі сабралі нас разам, за што мы ім вельмі ўдзячныя. Але год нашага супрацоўніцтва быў патрачаны ўпустую».

**Таццяна Камарова:** «Іх бачанне не супадала з нашым. Таму зразумелі, што працаваць, хутчэй за ўсё, давядзецца зусім не ў тым фармаце. Для чарговага выступлення мы самі пашылі сабе касцюмы, купілі абутак, а потым за працу нам нават грошай не вярнулі...»

***— На «Х-фактар» вы паехалі ўжо без прадзюсараў?***

**Марыя Разумава:** «Зразумеўшы, што нічога не адбываецца, узялі ініцыятыву ў свае рукі».

***— У якім рэчышчы плануеце развівацца?***

**Марыя Яковіч:** «Мы хацелі б мець прафесійную каманду і ведаем, што яна ў нас з'явіцца. І калі прадзюсар і будзе, то дакладна не з Беларусі. Бо наша мэта — быць сур'ёзным калектывам. Таму што, калі бачыш узровень музычных гуртоў за мяжой, то і сам імкнешся да якасці ў працы. Цяпер ездзім на розныя праекты. Хочацца прасоўваць сябе і нашу краіну. І конкурс «Новая хваля» — яркая добрая магчымасць прадэманстраваць свае мэты на міжнародным узроўні».

***— А складана быць «нефарматным» калектывам?***



**Таццяна Камарова:** «На мой погляд, паняцце «фармат» не павінна існаваць у артыстычным асяродку. Так, мы выглядаем нефарматна для звыклага ўспрымання людзей. Але як артысты — мы добрыя выканаўцы. І да гледача выходзім, не акцэнтуючы ўвагі на тое, з'яўляемся мы фарматам ці не. Знешнасць другасная, а на першым месцы заўсёды вакал. І сама публіка ў нейкі момант забывае пра розныя «параметры». Мы ж ведаем дакладна: добрага артыста павінна быць шмат».

***— Песня «Go on, Baby», з якой вы ўдзельнічалі ў адборы на «Еўрабачанне-2015», у чым яна сугучная вам?***

**Марыя Разумава:** «Усе мы атаясамліваем сябе з такім вобразам дзяўчыны. Не важна, хто ты, дзе нарадзілася, з кім сустракалася — ідзі і дабівайся сваіх мэтаў. Песню мы запісалі вельмі хутка, бо яна блізкая нам па духу і па настрою».

**«Мы выглядаем нефарматна для звыклага ўспрымання людзей. Але як артысты — мы добрыя выканаўцы.**

**Марыя Яковіч:** «Калі правесці паралель з нашай творчай гісторыяй, то яна сімвалічная. Бо мы не будзем жыць, як раней, пойдзем далей. Гэта наш заклік да кожнага — ніколі не адчайвацца!»

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*

Акорды металу

# ІХ АБ'ЯДНАЛА «ЦЯЖКАЯ» МУЗЫКА

**Гродзенскі гурт My Last GoodBay быў заснаваны ў 2010 годзе. Ідэя ўзнікла нечакана: сабраліся хлопцы пайграць цяжкую музыку — так і склаўся калектыў. Адзін з яго ўдзельнікаў, Паша Аверкіеў, расказаў, чым жывуць і захапляюцца сябры па камандзе.**

***— Які ваш склад і сярэдні ўзрост? Чым займаецеся, апроч музыкі?***

— Нас пяць чалавек: я — гітара, Юра Клімовіч — другі гітарыст і вакал, Цімафей Фіялко (ён жа гукарэжысёр) — ударныя, Андрэй Шуйскі — вакал, Кацярына Бялко — вакал. А ўзрост — ад 17 да 24 гадоў.

У звычайным жыцці я вучуся на аўтамеханіка-электрыка ў электрамеханічным каледжы, а захапляюся экстрэмальным катаннем на роліках. Юра працуе барменам і фанацее ад матацыклаў. Цімафей працуе ў краме сантэхнікі. Андрэй — кухар, а ў вольны час захапляецца паркурам. Кацярына вучыцца на лінгвіста-перакладчыка, вельмі любіць хатніх жывёл.

***— Дзе выступае гурт?***

— Найперш на фестывалях. Бо канцэрты — гэта сольныя выступленні, калі адзін гурт грае дзесьці паўтары гадзіны. Але каб выступаць так, гурт павінен быць даволі папулярным. Што тычыцца месцаў выступленняў, то мы былі ў Гродне, Мінску, Рэчыцы, Баранавічах.

У асноўным аддаём перавагу такім музычным кірункам, як металкор, мелодык, метал, кор. Дарэчы, на фестывалях прыкладны арыенцір — таксама цяжкая музыка.

***— Што наконт мар?***



Паша Аверкіеў за любімай справай.

— Асабіста мае звязаны толькі з музыкай. Я хацеў бы рухацца ў музычнай кар'еры ўверх, зарабляць на гэтым грошы. Пакуль гэта сапраўды толькі мары, але я раблю ўсё, каб яны здзейсніліся.

Напрыканцы размовы я прапанавала Пашу даць некалькі парад музыкантам-пачаткоўцам. Вось што ён сказаў: «Па-першае, жаданне працаваць павінна быць ва ўсіх удзельнікаў калектыву. Па-другое, гэта сумесная дзейнасць. Неабходна думаць разам, бо музыка, як матэматыка: тут усё разлічваецца. І апошняе — рэгулярныя заняткі ўсіх членаў гурта: і барабаншчыка, і гітарыста, і вакаліста. Інакш нічога добрага не выйдзе».

**Таццяна ЛАУШ,**
**студэнтка ІІ курса факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму ГрДУ імя Я. Купалы.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.022.
Нумар падпісаны ў 19.30 26.08.2015 г.